ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_______________ А.Б.Заблоцкі
"18" кастрычніка 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

Дата правядзення: 31 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 13.00.

**IX клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Да прапанаваных у першай калонцы імёнаў падбярыце тыя, якія адрозніваюцца ад іх адным гукам. Запішыце падабраныя імёны ў другой калонцы, а гукі, якімі адрозніваецца кожная пара імёнаў, у трэцяй.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

| Імя | Імя, якое трэба падабраць | Гукі, якімі адрозніваюцца імёны |
|---|---|---|
| **Узор:** Аліна | Аліса | [н] – [с] |
| Алег | | |
| Алеся | | |
| Жанна | | |
| Марыя | | |
| Ной | | |
| Улад | | |
| Фёдар | | |

**Заданне 2.** У беларускай мове для называння музычных паняццяў выкарыстоўваецца шэраг слоў, запазычаных з розных еўрапейскіх моў. Запішыце літары, прапушчаныя ў гэтых словах на беларускай мове.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Іншамоўныя назвы музычных паняццяў | Пераклад на беларускую мову | Прапушчаныя літары |
|---|---|---|
| accordeon (фр.) | акард…н | |
| adagio (іт.) | адаж… | |
| castañetas (ісп.) | кастан…ты | |
| diapasone (гр.) | д…пазон | |
| diese (фр.) | д…з | |
| fortepiano (іт.) | фартэп…на | |
| trio (іт.) | тр… | |
| Triole (ням.) | тр…ль | |
| viola (іт.) | в…ла | |
| violoncello (іт.) | в…ланчэль | |

**Заданне 3.** Унутраная форма слова – гэта прыкмета, якая ляжыць у аснове наймення. Напрыклад, унутранай формай назвы *падснежніка* з'яўляецца тое, што гэта кветка расце <u>пад снегам</u>.

Назавіце расліны, якія маюць указаную ўнутраную форму.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

| Унутраная форма | Расліна |
|---|---|
| аксамітная навобмацак | |
| добры меданос | |
| клейкая, як смала | |
| мае форму звона | |
| насенне раздзімаецца ветрам | |
| першым цвіце ранняй вясной | |
| улюбёны корм зуброў | |

**Заданне 4.** Фіналь (канцавая частка слова) *-іва* ўласціва словам сучаснай беларускай мовы. Прывядзіце па адным прыкладзе слоў з гэтай фіналлю, якія адпавядаюць акрэсленай у табліцы характарыстыцы.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| Характарыстыка слова | Слова з фіналлю *-іва* |
|---|---|
| назоўнік без суфікса | |
| назоўнік з суфіксам *-ів-* | |
| прыслоўе з суфіксам *-ів-* | |
| прыслоўе з суфіксам *-лів-* | |
| складанае слова | |

**Заданне 5.** Выпішыце са сказаў фразеалагізмы са структурай словазлучэння. Вызначыце від падпарадкавальнай сувязі кампанентаў фразеалагізма і яго сінтаксічную ролю.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

1. Гасцей з пустымі рукамі ніхто не любіць.
2. Зноў садзіцца на хлеб і ваду нікому не хацелася.
3. За прэстыжную працу трэба трымацца абедзвюма рукамі.
4. Вобраз каханай дзяўчыны днём і ноччу стаяў маладому чалавеку ўваччу.
5. Пасля таго выпадку настаўнік змяніў сваю тактыку на сто восемдзесят градусаў.
6. Яму трэба было падрыхтавацца да экзамену, лёгка сказаць, за адзін дзень.

| № | Фразеалагізм | Від падпарадкавальнай сувязі | Роля ў сказе |
|---|---|---|---|
| 1 | | | |
| 2 | | | |
| 3 | | | |
| 4 | | | |
| 5 | | | |
| 6 | | | |

**Заданне 6.** Выберыце ў кожным сказе правільную словаформу і запішыце яе ў калонцы справа.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| № | Сказ | Правільная словаформа |
|---|---|---|
| 1 | Бацька з маці паехалі на кірмаш, і мы доўга чакалі іх *(абаіх, абодвух, абоіх)*. | |
| 2 | Ён быў *(вышэй, вышэйшы, найвышэйшы)* за ўсіх хлопчыкаў з класа. | |
| 3 | На класнай гадзіне мы гаварылі аб (*кавале, кавалі, кавалю*) і ягонай кузні. | |
| 4 | Настаўнік паказаў вучням, як выкопваць карані (*цыкорыі, цыкорыю, цыкорыя*). | |
| 5 | Паўтара (*тыдні, тыдня, тыдняў*) таму ў школе прайшло свята беларускай мовы. | |
| 6 | Моцныя людзі не баяцца жартаў (*з сабе, з сябе, над сабой*). | |

**Заданне 7.** У Рэспубліцы Беларусь прынята прысвячаць кожны новы каляндарны год якой-небудзь важнай грамадскай ідэі. Перакладзіце на беларускую мову інфармацыю пра 2022 год, ужываючы, дзе трэба, вялікую літару.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Главой государства подписан указ №1, согласно которому в целях формирования объективного отношения общества к историческому прошлому, сохранения и укрепления единства белорусского народа 2022 год в беларуси объявлен годом исторической памяти.

Правительству поручено с участием генеральной прокуратуры, национальной академии наук беларуси, облисполкомов, минского горисполкома разработать и утвердить республиканский план мероприятий по проведению в 2022 году года исторической памяти.

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8.** Сярод фактаў, звязаных з характарыстыкай літаратурных жанраў, знайдзіце памылковыя і адзначце іх кружочкам.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Жанры | Факты |
|---|---|
| Апавяданне | 1. Як правіла, мае адну сюжэтную лінію.<br>2. Адносіцца да роду эпасу.<br>3. Падзеі разгортваюцца на працягу вельмі доўгага прамежку часу.<br>4. У беларускай літаратуры атрымала распаўсюджанне толькі ў другой палове XX стагоддзя. |
| Байка | 1. Мае павучальны або выкрывальны характар.<br>2. Адным са структурных элементаў з'яўляецца мараль.<br>3. Адносіцца да роду драмы.<br>4. Утрымлівае алегарычныя вобразы. |
| Паэма | 1. Мае сюжэт (расказвае пра важныя падзеі, апявае моцныя характары і інш.).<br>2. Не атрымала распаўсюджання ў беларускай літаратуры.<br>3. Часцей вялікі вершаваны твор.<br>4. Адносіцца да роду лірыкі. |

**Заданне 9**. Трое з пералічаных персанажаў адносяцца да аднаго літаратурнага твора, а чацвёрты з'яўляецца лішнім, ён "прыйшоў" з іншага твора. Запішыце ў адпаведных радках:

а) таго, хто "прыйшоў" з іншага твора,

б) назвы абодвух твораў і іх аўтараў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

*1. Мульцік, Машэка, Наталька, багаты баярын*

Адказ:

а) ____________________

б) ____________________

*2. Глечык, Аліндарка, Свіст, Карпенка*

Адказ:

а) ____________________

б) ____________________

*3. Сцяпан Крыніцкі, Пранцісь Пустарэвіч, Юрый Гораў, Агата*

Адказ:

а) ____________________

б) ____________________

*4. Цімох Альпенскі, шляхціц Завальня, Харытон Куторгі, Куліна.*

Адказ:

а) ____________________

б) ____________________

**Заданне 10**. Запішыце тры творы пра Вялікую Айчынную вайну, якія вы вывучалі на ўроках беларускай літаратуры, а таксама аўтараў гэтых твораў.

Назавіце шэсць агульных рыс гэтых твораў, акрамя тэматыкі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **№** | **Назва твора** | **Аўтар** |
|---|---|---|
| 1 | | |
| 2 | | |
| 3 | | |

Агульныя рысы:

1. Тэма – Вялікая Айчынная вайна.

2. ________________________________________________

3. ________________________________________________

4. ________________________________________________

5. ________________________________________________

6. ________________________________________________

7. ________________________________________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага
ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
А.В.Заблоцкі
"18" кастрычніка 2023 г.

**ЗАДАННІ**
**для правядзення рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"**

**ВОДГУК**

Дата правядзення: 30 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

**IX клас**

**Словы**

Над намі словы уладараць.
Мы чуем і гаворым іх.
Яны то здружаць, то пасвараць
Сяброў і ворагаў маіх.

Бо словы розныя бываюць.
Адны – агню стрымаюць шквал,
Другія словы забіваюць
Усё жывое напавал.

Ад слова сэрца халадзее,
Праходзяць сон і забыццё,
Ад слова рушацца надзеі,
Ад слова свеціцца жыццё.

Ад слова вырастаюць крылы,
А ў сэрца стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык не шкадуйце шчырых слоў!

А здатным толькі на дакоры
І гучна словамі грымець,
Каб не прыносіць людзям гора,
Было б найлепей анямець.

*Сяргей Грахоўскі*
*1962*